# КАРЭКЦІРОЎКА АРФАГРАФІЧНЫХ УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ
## (на матэрыяле твораў Якуба Коласа)

Ва ўмовах сучаснага адукацыйнага асяроддзя перад настаўнікамі беларускай мовы стаіць дастаткова складаная задача – фарміраваць высокаразвітую, нацыянальна свядомую моўную асобу, якая будзе карыстацца роднай мовай ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Адным з паказчыкаў высокаразвітой асобы выступае яе маўленне – як вуснае, так і пісьмовае. У сваю чаргу неад'емным складнікам правільнага пісьмовага маўлення з'яўляецца арфаграфічная пісьменнасць. Нягледзячы на тое, што валоданне арфаграфічна правільным пісьмом на працягу дзесяцігоддзяў разглядаецца як адна з найважнейшых мэт навучання беларускай мове, як паказчык моўнага і маўленчага развіцця вучняў, пытанне аб эфектыўнасці навучання арфаграфіі застаецца асноўным у методыцы выкладання беларускай мовы і ў XXI стагоддзі. Асабліва востра яно паўстае ў сувязі з прыняццем закона Рэспублікі Беларусь "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" і рэалізацыяй яго ў практыку навучання беларускай мове.

Аднак у сучаснай методыцы навучання арфаграфіі на першы план выступаюць не чыста арфаграфічныя прыярытэты, а фарміраванне збалансаванага адзінства арфаграфічна-маўленчых уменняў і навыкаў, неабходных для станаўлення правільнага пісьма ў працэсе камунікацыі. Як паказвае практыка, толькі сувязь засваення моўнай сутнасці арфаграфічных правіл (фанетычнай, лексічнай, словаўтваральнай, граматычнай, семантычнай) з развіццём маўлення дае магчымасць усвядоміць сістэмны характар арфаграфіі і свядома прымяніць правілы ў працэсе пісьма, "забяпечваючы тым самым адзінства мовы і мыслення, адзінства тэорыі і практыкі, ведаў і навыкаў" [3, с. 3].

Веды па арфаграфіі і адпаведныя правапісныя ўменні і навыкі фарміруюцца і ўдасканальваюцца на ўсіх этапах навучання, таму гэта задача разглядаецца як скразная на працягу вывучэння ўсяго курса беларускай мовы.

Асаблівую значнасць працэс ўдасканалення арфаграфічных уменняў і навыкаў набывае на этапе абагульнення і сістэматызацыі вывучанага на апошніх ступенях навучання, калі вучні ўжо ў асноўным арыентуюцца ў арфаграфічнай сістэме, умеюць супастаўляць, параўноўваць, праводзіць лінгвістычныя паралелі, выяўляць лагічныя сувязі.

Апошнім часам працэс удасканалення навыкаў вучоныя-метадысты звязваюць з паняццем "карэкціроўка". Разглядаючы карэкціроўку арфаграфічных навыкаў як састаўную частку паняцця "ўдасканаленне", Т.П. Малявіна разумее яго як "метад навучання, адзін з напрамкаў работы над памылкамі, аснову якога складае выпраўленне навыку няправільнага напісання як шматкампанентнага і шматузроўневага аўтаматызаванага арфаграфічнага дзеяння (умення), якое ўтрымлівае ў сабе нейкія дэфекты

структуры, што з'яўляюцца вынікам памылковых інтэлектуальных дзеянняў вучняў па рашэнні арфаграфічных задач" [4, с. 5].

У сувязі з тым, што адным з падыходаў, на аснове якога ажыццяўляецца навучанне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, з'яўляецца тэкстацэнтрычны падыход, а інтэнсіўнае выкарыстанне тэкстаў на занятках дае значны вынік па засваенні правапісных нормаў, мэтазгодна і працэс карэкціроўкі арфаграфічных навыкаў арганізаваць на матэрыяле тэксту, бо якраз ён "з'яўляецца ўзорам пісьмовага маўлення з пукту гледжання стылістычнага, арфаграфічнага і пунктуацыйнага афармлення" [2, с. 9]. Пры падборы тэкстаў ў якасці дыдактычнага матэрыялу неабходна таксама памятаць пра іх выхаваўчы і развіццёвы патэнцыял, у пераходны перыяд арганізоўваць працу з тэкстамі, адаптаванымі ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй "Правіл беларускай арфаграфіі".

Прывядзём узоры заданняў на матэрыяле твораў Якуба Коласа, якія ў рамках карэкцыйнай работы можна прапанаваць вучням на апошніх ступенях навучання.

Першапачаткова з мэтай дыягностыкі ўзроўню падрыхтаванасці вучняў па арфаграфіі мэтазгодна правесці дыктант, на аснове якога настаўнік робіць вывад пра неабходнасць карэкціроўкі тых ці іншых правапісных уменняў і навыкаў. На гэтым этапе навучання мэтазгодна запісаць пад дыктоўку адаптаваны коласаўскі тэкст з неабходнай колькасцю арфаграм. Выяўленне тыповых памылак дасць магчымасць вызначыць сістэму арфаграм, засваенне якіх патрабуе карэкціроўкі.

У якасці наступнага задання можна прапанаваць скласці алгарытм напісання складанай для засваення арфаграмы, абагульніць арфаграфічны матэрыял у выглядзе плана паведамлення, выкарыстаўшы сучасныя даведнікі па арфаграфіі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, што дазволіць карэкціраваць разумовыя дзеянні вучняў, развіваць іх інтэлект і лагічнае мысленне.

Як адначаюць метадысты, спецыфіка карэкцыйнага практыкавання заключаецца ў тым, што "ў працэсе яго выканання вучні назіраюць за ўласнымі інтэлектуальнымі дзеяннямі, адкрываючы для сябе прабелы ва ўласных ведах і затым (з дапамогай настаўніка, падручніка, слоўніка ці даведніка) ліквідуючы іх" [2, с. 9]. Падчас карэкцыйнай работы так , як і на іншых этапах навучання, варта браць пад увагу індывідуалізацыю і дыферэнцыяцыю навучання.

У вучняў выклікае цікавасць праца з тэкстам, на аснове якой арганізуецца самастойная пошукавая дзейнасць, што будзе садзейнічаць матывацыі навучання, развіццю моўнага чуцця. У гэтым аспекце цікавым падаецца матэрыял "Казак жыцця", з якімі вучні знаёміліся на ўроках літаратуры. У якасці дыдактычнага матэрыялу можна выкарыстаць урывак з казкі "Хмарка".

Ніякага клопату і гора не ведала гэта прыгожая белая Хмарка. Добра было ёй плыць высока-высока ў безгранічных разлогах свету і акідаць поглядам прыгожыя малюнкі зямлі, што ляжала пад ёю.

З гэтай страшэннай вышыні, на якой плыла Хмарка, усё выглядала вельмі прыгожа, бо здалёку ўсё ўяўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе. Такая ўжо натура і схільнасць нашай душы – бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі. І паплыла паволі шчаслівая хмарка ў далёкую-далёкую дарогу. А поле з пясчанымі схіламі сваіх узгоркаў, зялёныя лугі з пакручастымі стужкамі бліскучай вады, адвечныя лясы і бары – усе тыя з'явы, якія першымі кінуліся ў вочы нованароджанай Хмарцы, заставаліся ўсё далей і далей. Уласнае шчасце Хмаркі не давала ёй магчымасці заўважыць чужое гора. Ёй здавалася, што ўсе на свеце радуюцца і цешацца сваёй доляй. Па гэтай прычыне Хмарка не ведала, якую тугу пакідае яна за сабою на зямлі, з якой прагавітасцю чакала поле задаволення сваёй смагі (Паводле Я. Коласа).

У сувязі з тым, што "ўдасканаленне функцыянальнай арфаграфічнай… пісьменнасці адбываецца менавіта ў ходзе практычнай маўленчай дзейнасці – чытання, слухання і самастойнага стварэння тэкстаў розных моўных стыляў, тыпаў і жанраў, гаварэння, асэнсаванага пісьма" [5, с.197], мэтазгоднымі з'яўляюцца разнастайныя заданні па карэкціроўцы арфаграфічных уменняў і навыкаў.

Падчас працы з тэкстам першапачаткова даюцца заданні, накіраваныя на разуменне вучнямі яго зместу, вызначэнне адрасата, мэтанакіраванасці, тыпу і стылю маўлення, на ўдасканаленне ўмення аргументаваць уласную думку, што з'яўляецца неабходнай умовай карэкціроўкі арфаграфічных уменняў і навыкаў.

Затым вучням можна прапанаваць уласна арфаграфічныя і комплексныя заданні па тэксце:

1. Прачытайце тэкст. Назавіце словы, у напісанні якіх вы маглі б памыліцца. Растлумачце, чаму гэтыя словы пішуцца так, як у тэксце.

2. Выпішыце з тэксту прыклады слоў на ўсе выпадкі правапісу галосных **е, я** пасля мяккіх зычных. Якіх выпадкаў правапісу галосных вы не знайшлі ў тэксце. Карыстаючыся дапаможнікам па арфаграфіі і пунктуацыі "Пішам па-беларуску" раскажыце пра напісанне каранёвага **я** ў словах.

3. Абгрунтуйце напісанне слова *Хмарка* з вялікай літары.

4. Выпішыце з тэксту пяць слоў з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.

5. Выкарыстоўваючы элементы словаўтваральнага разбору, растлумачце значэнне і напісанне слоў *разлогі*, *прагавітасць*, *задаволенне*.

5. Растлумачце, чаму ў першай частцы слова *нованароджаная* пішацца **о**. Карыстаючыся "Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы для школьнікаў" пад рэд. Г.М. Малажай, назавіце словы, напісанне якіх вызначаецца такой самай умовай.

6. На матэрыяле тэксту раскажыце пра напісанне **у** і **ў**. Правядзіце аналіз правілаў напісанне **у** і **ў** рэдакцыі 1959 і 2008 гадоў.

7. Падрыхтуйце паведамленне на лінгвістычную тэму, выкарыстоўваючы пачатак: "У тэксце дастаткова часта сустракаюцца наступныя арфаграмы...". Падмацуйце свае назіранні прыкладамі з тэксту.

Прапанаваныя практыкаванні заснаваны на аналітычнай дзейнасці вучняў, іх уменні выбіраць і сістэматызаваць арфаграфічны матэрыял і накіраваны на ўдасканаленне ўмення ствараць паведамленне на лінгвістычную тэму, што садзейнічае развіццю маўлення старшакласнікаў.

У якасці аднаго з заданняў да прааналізаванага тэксту мэтазгодна прапанаваць прыдумаць арфаграфічнае практыкаванне для сваіх таварышаў. Гэта можа быць слоўнікавы дыктант на пэўны тып арфаграм, ускладненае спісванне, займальна-арфаграфічныя практыкаванні на матэрыяле слоў з тэксту, заданне на параўнанне і супастаўленне напісанняў **не, ні** з рознымі часцінамі мовы і інш. Такая праца патрабуе ад вучняў актуалізацыі ведаў па розных раздзелах арфаграфіі, уважлівага стаўлення да кожнага слова, кожнай арфаграмы, выяўлення месцаў, дзе могуць быць дапушчаны памылкі, што будзе садзейнічаць развіццю арфаграфічнай пільнасці вучняў, творчага стаўлення да працэсу навучання.

Фарміраванні арфаграфічнай пільнасці садзейнічае работа па пошуку і класіфікацыі ўсіх арфаграм, пададзеных у тэксце, падбор урыўкаў з Коласавых твораў, што з цягам часу могуць быць выкарыстаны ў якасці навучальных дыктантаў.

Як ужо адзначалася, удасканаленню функцыянальнай пісьменнасці садзейнічаюць і шматлікія творчыя практыкаванні. Так, мэтазгодна будзе нагадаць, чым закончылася філасофская казка Я. Коласа “Хмарка”, вызначыць асноўную думку гэтага твора, сцісла пераказаць яго. У якасці самастойнай працы прапануецца напісаць невялікае сачыненне на тэму, што адпавядае прааналізаванаму тэксту: “Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі”. У ходзе падрыхтоўкі да напісання сачынення праводзіцца арфаграфічная работа, арганізуецца праца са слоўнікамі, даведнікамі. Па выніках творчай работы праводзіцца праверка і ўзаемаправерка работ, абгрунтоўваецца неабходнасць правільных напісанняў.

Адным з цікавых відаў працы з тэкстам з’яўляецца яго рэдагаванне. На думку Д.М. Богаяўленскага, “успрыманне памылкова напісанага слова само па сабе не можа нанесці ўрон навучанню. Таму…калі ўспрыманню памылкі супрацьстаіць установка вучня на ўзнаўленне правіла, якое адпавядае дадзенай арфаграме, пераможцам аказваецца інтэлектуальная дзейнасць, звязаная з ўсведамленнем памылкі [1, с. 285]. У якасці карэкцыйнага практыкавання можна прапанаваць прааналізаваць вучнёўскае сачыненне (раздрукаванае ці змешчанае на інтэрактыўнай дошцы) на згаданую вышэй тэму, у якім сустракаецца вялікая колькасць арфаграфічных памылак. Пры аналізе працы першапачаткова звяртаецца ўвага на тое, ці адпавядае творчая работа тыпу, стылю маўлення, ці рэалізавана мэта дадзенага тэксту, ці прасочваецца логіка раскрыцця тэмы, а затым выяўляюцца ключавыя словы і выразы і інш. Пасля гэтага пажадана выканаць чыста арфаграфічнае заданне знайсці ў сачыненні словы, якія б вучні напісалі інакш, і абгрунтаваць іх напісанне. Асаблівая ўвага звяртаецца на арфаграмы, напісанне якіх не адпавядае сучасным “Правілам беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008

г.). У сувязі з гэтым арганізуюцца арфаграфічныя хвілінкі, прыводзіцца характарыстыка лінгвістычных умоў напісання той ці іншай арфаграмы.

Такім чынам, карэкцыйная работа па арфаграфіі на матэрыяле твораў Якуба Коласа разглядаецца як частка узаемазвязанага працэсу фарміравання моўных і маўленчых уменняў і навыкаў вучняў і садзейнічае развіццю міжпрадметных сувязей, свядомай, творчай актыўнасці, пазнавальнай самастойнасці школьнікаў, выхаванню павагі да беларускага слова як формы выражэння нацыянальнай культуры.

Літаратура:


1. Богоявленский, Д.Н. Психология усвоения орфографии / Д.Н. Богоявленский / Акад. пед наук РСФСР. Науч. исслед.. ин-т психологии. – Изд. 2-е, переработ. и доп. – М.: Просвещение, 1966. – 307 с.
2. Дейкина, А.Д., Малявина, Т.П. Реализация тектоориенированного подхода на занятиях по коррекции правописных умений и навыков в X – XI классах // Русский язык в школе. – 2011. – № 5. – С. 8 – 11
3. Ларионова, Л.Г. Развитие речи учащихся при изучении орфографии // Русский язык в школе. –2005. – № 2. – С. 3 – 9
4. Малявина, Т.П. О понятии «коррекция орфографического навыка» // Русский язык в школе. – 2008. – № 9. – С. 3 – 7
5. Протчанка В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка.—Мінск: НІА, 2001. – 212с.